Национальный архив
Республики Беларусь

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

# «Шчыры руплівец, клапатлівец на ніве ўзнаўлення і сцвярджэння гістарычнай памяці»



Віталь Уладзіміравіч Скалабан
(1947–2011)

Адметнае месца сярод беларускіх вучоных займае Віталь Уладзіміравіч Скалабан. «Рыцар фактаў», «чалавек-архіў», «архівіст з энцыклапедычнымі ведамі» — так вобразна характыразавалі В. Скалабана тыя, каму давялося з ім працаваць і ведаць яго асабіста.

Нарадзіўся Віталь Уладзіміравіч у в. Шылавічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У 1970 г. скончыў гістарычны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1987 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Белорусский национальный комиссариат (январь 1918 — 1919 гг.)».

З 1972 г. працаваў у выдавецтве «Беларуская савецкая энцыклапедыя». Пачаўшы з пасады малодшага рэдактара, у 1993 г. узначаліў рэдакцыю гісторыі Беларусі. У 1995—2000 гг. — намеснік дырэктара, саветнік Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы.

У 2000—2002 гг. на пасадзе намесніка дырэктара Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны. У 2002 г. прыйшоў на працу ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, дзе ў 2004 г. узначаліў аддзел публікацыі дакументаў.

Віталь Уладзіміравіч меў шырокае кола навуковых інтарэсаў: даследаваў гісторыю беларускага нацыянальнага руху, культуру IX — пачатку XX стст., займаўся пытаннямі гістарыяграфіі, архівазнаўства, краязнаўства і бібліяграфіі. Ён выявіў невядомыя тэксты беларускай літаратуры XIX ст. з рукапіснай спадчыны паэта А. Рыпінскага, матэрыялы пра жыццё і творчасць беларускіх пісьменнікаў, грамадскіх і культурных дзеячаў (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, А. Гаруна, Я. Хлябцэвіча і інш.). Менавіта В.У. Скалабан атрыбутаваў паэму «Тарас на Парнасе». Пад яго кіраўніцтвам і пры яго ўдзеле быў падрыхтаваны шэраг зборнікаў дакументаў, архіўных і міжархіўных даведнікаў. Выступаў як драматург: аўтар гістарычных драм «У жніўні 36-га» (пастаўлена на малой сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы у 2002 г.), «Абняць вышыню» (разам з А. Карэліным, 2004), «Людвіка і Фабіян» (разам з Л. Рублеўскай, 2006). Суаўтар сцэнарыяў дакументальна-мастацкіх тэлефільмаў. Зрабіў значны ўнёсак у справу папулярызацыі дзейнасці архіваў, удзельнічаў у радыё- і тэлеперадачах, аўтар шматлікіх артыкулаў. Узнагароджаны дыпломам Міжнароднага фонду імя Янкі Купалы за даследаванні і папулярызацыю літаратурнай спадчыны Янкі Купалы (1997), Ганаровай граматай рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва» за плённую дзенасць у развіцці літаратуры і мастацтва (2007), знакам «Ганаровы архівіст Беларусі» (2007).

Асабісты фонд сям'і Скалабанаў (бацькі Уладзіміра Рыгоравіча і сына Віталя Уладзіміравіча) захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Фонд 530 налічвае 643 справы, якія ўключаюць дакументы біяграфічнага характару і матэрыялы, сабраныя за гады працы і навуковай дзейнасці. Асабісты фонд В.У. Скалабана ёсць і ў Беларускім дзяржаўным архіве-музее літаратуры і мастацтва — фонд 500 налічвае 687 спраў. Значная частка матэрыялаў адносіцца да крыніц па гісторыі беларускай літаратуры.

У 1951 г. сям'я Скалабанаў пераехала са Слонімскага раёна ў г. Ляхавічы. Тут у сярэдняй школе № 2 працаваў бацька Віталя, Уладзімір Рыгоравіч Скалабан, настаўнік гісторыі і краязнаўца. Ён узначальваў раённае Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, стварыў пры школе гісторыка-краязнаўчы гурток «Следапыт».



Сям'я Скалабанаў. Віталь на руках у маці.
[1948 г.] НАРБ.

**Рана абуджаная любоў да гісторыі, жаданне вяртаць людзям памяць пра слаўнае мінулае родных мясцін з'явіліся, бясспрэчна, пад моцным уплывам яго бацькі. Захапленне гісторыяй прадвызначыла выбар жыццёвага шляху...**

Г.В. Запартыка



1

Тетрадь
по истории
ученика XI-А класса
Ляховичской СШ № 1
Скалабана Виталия

**Мне везло на хороших учителей. И в Ляховичской средней школе, и в Ленинградском государственном университете, где учился на историческом факультете, и в Минске...**

В. Скалабан



Героическая оборона Севастополя.

1. Война не застала врасплох (предупреждение 22 июня ночью).
2. 30 октября танки фашистов вышли к [illegible]. Противник 1200 танков, 500 [illegible] 200 [illegible]
Севастополь [illegible]
Создан городской комитет обороны.
3. Корабли отведены к Кавказу.
4. Бои на [illegible]
5. Помощь из Новороссийска. Приход Приморской армии.
7. 7 ноября 5 [illegible]
[illegible]
8. 30 октября – 21 ноября – первое наступление.

2

9. 17 декабря – начало 2 наступления (большое [illegible] техники врага).
10. Отступление. В день по 10-15 атак
11. Героизм сов. воинов.
12. 31 декабря – срыв наступления.
13 Январь-май 1942.
а). позиционные бои.
б. военная промышленность.
в. подвиги и [illegible]
14. 3 наступление. 12 июня – 1 июля.
а) взятие Керчи.
б. налёты авиации.
в.) героизм матросов.
г). прорыв [illegible] 19 июня.
15. 30 июня приказ об оставлении

Сшытак па гісторыі вучня 10-га класа Ляхавіцкай сярэдняй школы Віталя Скалабана.
БДАМЛМ.



Ленинградский ордена Ленина государственный университет имени А. А. Жданова

К-162

Общежитие № 6

ПРОПУСК

на право входа в общежитие

Дан студенту тов. В. В. Скалабан

прожив. к-та № [illegible]

Выдан 19/IX 1966

Комендант [signature]

2

Срок действия по 01 сент. 1967

Действителен по 01 сент. 1968 г.

Комендант [signature]

Действителен по 01 сент. 1969 г.

Комендант [signature]

Действителен по 01 июля 1970 г.

Комендант [signature]

Действителен по ........ 19..... г.

Комендант

15-VIII-1964 г. Тип. ЛОЛГУ. Зак. 601—800.

Пропуск В.У. Скалабана ў студэнцкі інтэрнат.
1966 г. БДАМЛМ.



8

Дорогие мои, здравствуйте! 21/IV-6[illegible]

Деньги получил, спасибо. Одновременно получил и перевод от Валика (25 р.) Так что в мае не высылайте.

Занятия идут хорошо, сессия будет тяжелая, шесть экзаменов (диамат, политэкономия, история СССР, история средних веков, история КПСС, военная подготовка).

Папину статью получил. Возможно, что я помещу в „Полымя" статью о Е. С. Канчере, профессоре, белорусском деятеле в 17-18 гг для опубликования в разделе „Беларуская энцыклапедыя." Е. С. Канчер ко мне относится доброжелательно. Папа, если есть в Ляховичах „История БССР" т. 2, то вышли мне. Канчер Е. С. просил меня достать её, нужно [illegible]

Ліст В.У. Скалабана родным.
21 красавіка 1967. НАРБ.

Воспитанник Санкт-Петербургского (Ленинградского) университета, В. Скалабан со студенческих времен имел счастливую возможность окунуться в мир науки, дышать его воздухом. Богатейшие архивные, библиотечные, музейные собрания города на Неве вселяли надежду на возможность реализации научных планов, которые возникли еще у Скалабана-школьника...

М.Ф. Шумейко



10

Рекомендую на конкурс студенческих научных работ, посвященный 100-летию со дня рождения В.И.Ленина, работу студента У курса исторического факультета Ленинградского государственного ордена Ленина и ордена Трудового Красного знамени Университета им.А.А.Жданова В.В.Скалабана " "В.И.Ленин и создание БССР".

В.В.Скалабан уже на младших курсах обнаружил большой интерес к истории Советской Белоруссии, особенно к ее ранним этапам. Занимаясь изучением возникновения и деятельности Белорусских секций РКП/б/, он вместе с тем не раз обращался к темам смежным. Одним из таких обращений и является настоящая работа.

Работу В.В.Скалабана "В.И.Ленин и создание БССР", как и другие его исследования, отличает хорошее знание литературы вопроса, обстоятельное знакомство со всеми доступными для него источниками, самостоятельность и аргументированность суждений.

По теме представленной на конкурс работы В.В.Скалабаным опубликованы две небольшие заметки: "Ленин распрашивает о Белоруссии"/"Літаратура і мастацтва" 29 июня 1968 г./ и "Михаил Пригоровский" /"Полымя", 1968, № 12 /.

Научный руководитель- кандидат исторических наук /А.Красникова/.

1969 г.

Рэкамендацыя работы В.У. Скалабана да ўдзелу ў студэнцкім конкурсе. 1969 г. НАРБ.



Падчас вучобы ва ўніверсітэце. БДАМЛМ.



2

Х А Р А К Т Е Р И С Т И К А

студента У курса дневного отделения исторического факультета Ленинградского университета ЛГУ СКАЛАБАНА Виталия Владимировича

Скалабан Виталий Владимирович, 1947 года рождения, белорус, из служащих, член ВЛКСМ с 1961 года.

Скалабан В.В. поступил в 1965 году на вечернее отделение исторического факультета, а в 1966 году был переведен на дневное отделение. Занимался все годы в историко-партийной группе. Скалабан В.В. хорошо учится и проявил большой интерес и незаурядные способности к научно-исследовательской работе. Занимаясь изучением истории образования и деятельности Белорусских секций РКП(б), он добился серьезных успехов в разработке этой проблемы и опубликовал в общественно-политических журналах и Энциклопедии БССР несколько статей и заметок, отражающих результаты его исследования. В.В.Скалабан непременный участник студенческих научных конференций. Дважды он выступал с докладами на Всесоюзных студенческих научных конференциях. Его работы неоднократно отмечались на конкурсах лучших студенческих работ.

Во время прохождения педагогической практики В.В.Скалабан обнаружил и хорошие преподавательские данные. Его уроки отличались логичностью, продуманностью. Он быстро и успешно находит контакт с аудиторией.

Вместе с тем В.В.Скалабан никогда не замыкался только в сфере академических интересов и дел. Все годы обучения на историческом факультете он принимал активное участие в общественной жизни: избирался комсоргом группы и членом курсового бюро ВЛКСМ, был членом студсовета общежития, а также участвовал в факультетской самодеятельности, работал на студенческой летней стройке в Талнахе.

С октября 1968г. В.В.Скалабан успешно ведет кружок по истории КПСС в сети партийного просвещения завода им.Н.Г.Козицкого.

В.В.Скалабан обладает живым, непосредственным характером. Активен. Энергичен. Любознателен.

Зам.декана истфака доцент Чумичев В.А.
Секретарь партбюро доцент Мальцев М.С.

Характарыстыка студэнта 5-га курса ЛДУ В.У. Скалабана. [1970 г.] НАРБ.


Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ВСЕСОЮЗНЫЙ ЛЕНИНСКИЙ КОММУНИСТИЧЕСКИЙ СОЮЗ МОЛОДЕЖИ

Комсомольский документ оставлен на хранении к/к АН БССР

Секр к/к АН БССР

УЧЕТНАЯ КАРТОЧКА ЧЛЕНА ВЛКСМ

№ 05955448

1. Фамилия Скалабан
Имя Виталий Отчество Владимирович
2. Год и месяц рождения 1947, август
3. Пол мужской 4. Национальность белорус
5. Место рождения д. Шиловичи Слонимского района Гродненской области
6. Социальное положение служащий
7. Образование высшее
8. Месяц и год вступления в ВЛКСМ май 1962
9. Наименование комсомольского органа, утвердившего прием в комсомол Ляховичский райком ЛКСМ Белоруссии Брестской области
10. Месяц и год вступления в КПСС

ЦК ВЛКСМ

НАГРАДЫ

ОТМЕТКИ О ВЗЫСКАНИЯХ

Какое взыскание, за что, кем и когда наложено

Подпись секретаря комитета комсомола и печать

Кем и когда снято взыскание

Учетная карточка составлена Комитетом комсомола Академии наук Белоруссии г. Минска

Личная подпись комсомольца

Секретарь комитета комсомола

4 мая 1975 г.
(дата составления карточки)

Уліковая картка члена ВЛКСМ
В.У. Скалабана. 1975 г. НАРБ.


Главная редакция
Белорусской Советской Энциклопедии АН БССР
ВРЕМЕННЫЙ ПРОПУСК
на право работы в выходные дни с 9³⁰ до 17³⁰ ч.
Редакция истории БССР
тов. Скалабану В. В.
разрешается работать в каб № ____
с 23. 02. 1974 г. по ____ 197_ г.
Действительный при предъявлении удостоверения личности
М.п. Ст. инспектор по кадрам и спецработе БелСЭ
21 02 1974 г.

Часовы (бестэрміновы) пропуск
В.У. Скалабана на працу ў рэдакцыі гісторыі БССР выдавецтва «БелСЭ»
ў выходныя дні.
1974 г. НАРБ.


Отчет
о работе соискателя Института истории АН БССР В.В. Скалабана с апреля 1980 г. по ноябрь 1982 г.

Тема диссертации:
Белорусский национальный комиссариат (январь 1918 – март 1919 гг.)

Научный руководитель —
доктор исторических наук
П.А. Селиванов

За отчетный период изучались труды классиков марксизма-ленинизма, партийные документы по национальному вопросу. Составлена библиография книжных изданий, журнально-газетных статей по теме исследования. Много внимания было уделено историографии проблемы, в частности, впервые попыткам дать оценку деятельности Белнацкома (материалы периодической печати 1918–20 гг., отчеты Наркомнаца и Белнацкома,

Справаздача саіскальніка Інстытута гісторыі АН БССР
В.У. Скалабана аб працы над дысертацыяй
за 1980—1982 гг. НАРБ.


В.У. Скалабан. 1980-я гг. БДАМЛМ.















Энцыклапедыі і слоўнікі,
у падрыхтоўцы і выданні
якіх удзельнічаў
В.У. Скалабан.



2

Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў Беларускай ССР
па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю

Беларускі рэспубліканскі камітэт прафсаюза
работнікаў культуры

ГАНАРОВАЯ
ГРАМАТА

Навуковаму рэдактару рэдакцыі гісторыі
БССР і археалогіі выдавецтва "Беларуская
Савецкая Энцыклапедыя"

тав. СКАЛАБАНУ Віталію Уладзіміравічу

за шматгадовую актыўную работу ў друку і ў
сувязі з паспяховым завяршэннем выдання
12-томнай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі

Старшыня
Дзяржаўнага камітэта
Савета Міністраў БССР
па справах выдавецтваў,
паліграфіі
і кніжнага гандлю

1975

Старшыня
Беларускага
рэспубліканскага
камітэта
прафсаюза
работнікаў культуры

Ганаровая грамата Дзяржкамвыдат навуковаму
рэдактару выдавецтва «БелСЭ» В.У. Скалабану.
1975 г. НАРБ.

**Неутомимого исследователя можно было видеть и на экране телевизора, и за кафедрой научной конференции, выступающим на литературном вечере и разбирающим архивные документы... такие люди, как Виталь Скалабан, распространяют вокруг себя творческий импульс, заряжают своим энтузиазмом...**

Л. Рублевская



2

Паважаны таварыш

Віталь Уладзіміравіч Скалабан!

Інстытут філасофіі і права АН БССР і секцыя эстэтыкі Беларускага аддзялення Філасофскага таварыства СССР запрашаюць Вас на навуковы сімпозіум "Эстэтычныя і сацыяльна-псіхалагічныя праблемы сучаснай мастацкай культуры", які адбудзецца 27 снежня 1984 г. /чацвер/ у будынку гуманітарнага корпуса Акадэміі навук БССР /вул. Сурганава, І, корп. 2, паверх 8, пакой 812/.

Пачатак а 10 гадзіне.

Рэгламент:
даклад 20 хвілін,
паведамленне 10–15 хвілін.

БДАМЛМ.



55

РОССИЙСКАЯ НАЦИОНАЛЬНАЯ БИБЛИОТЕКА

NATIONAL LIBRARY OF RUSSIA

18, Sadovaya st., St.-Petersburg, 191069, Russia. Tel. (812) 310-28-56. Fax. (812) 310-61-48

Рэспубліка Беларусь
220050 г. Мінск
кандыдату гістарычных навук,
сп. Віталю Скалабану

Паважаны Віталь Уладзіміравіч!

Расійская Нацыянальная бібліятэка і Санкт-Пецярбургскія асоцыяцыя беларусістаў запрашаюць Вас прыняць удзел у шостай штогадовай канферэнцыі "Санкт-Пецярбург і беларуская культура".
Падчас канферэнцыі мы спадзяемся абмеркаваць з Вамі перспектывы развіцця сучаснай беларусістыкі і магчымасць супрацоўніцтва ў гэтай галіне.

Канферэнцыя адбудзецца 7 чэрвеня 1999 года ў канферэнц-зале Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі па адрасу: Садовая вул., 18. Нажаль, арганізатары не змогуць узяць на сябе расходы на праезд і перабыванне ўдзельнікаў у Санкт-Пецярбургу.

З павагай:

Мікалай Віктаравіч Нікалаеў
доктар філалагічных навук
член Вучонага Савету РНБ
тэл. службовы: 272-97-71
хатні: 265-28-56
e-male: papers@nlr.ru

БДАМЛМ.






232
25

Тав. Скалабан В. У.

З'яўляецца ўдзельнікам урачыстага пасяджэння, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі **Якуба Коласа.**

29 кастрычніка 1982 года
Тэатр оперы і балета БССР

Пачатак у 18 гадзін.

НАРБ.




НАРБ.



46

Шаноўны(ая) спадар(ыня) Віталь Уладзіміравіч!

Запрашаем Вас на сьвяточнае адкрыцьцё Літаратурнага музэя Максіма Багдановіча і ўшанаваньне памяці паэта ў 100-я ўгодкі са дня яго нараджэньня, якое адбудзецца *8 сьнежня 1991 года аб 11-ай гадзіне* па адрэсе:

*м.Менск, вул.М.Горкага, д.7а (Траецкае прадмесьце),*

*Літаратурны музэй Максіма Багдановіча*

Запрашэнні В.У. Скалабана на навуковыя і культурныя мерапрыемствы. 1980–1990-я гг.






1997
56

Шаноўны (ая) В.У. Скалабан

*Маем гонар запрасіць Вас на ўрачысты сход, прысвечаны 600-годдзю пасялення татараў на землях Беларусі.*

*Сход адбудзецца 29 лістапада ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь (вул. Мяснікова, 44). Пачатак а 15 гадзіне.*

Даведкі па тэл.: **229-21-34** (Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур)
**222-46-64** (Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь)

**Аргкамітэт**

НАРБ.

**Ён быў чалавекам публічным ў самым глыбінным значэнні гэтага слова. Не баяўся ніякай аўдыторыі, умеў размаўляць з ёй нароўні...**

А. Бутэвіч



На «Каласавінах».
1986 г. НАРБ.



Пачатак 1990-х гг. НАРБ.



1990-я гг.
НАРБ.



На «Каласавінах».
1997 г. НАРБ.



Шаноўнае спадарства!

Запрашаем Вас прыняць удзел
у праглядзе і абмеркаванні
дакументальнага фільма
„НІКОЛІ Я НЕ ПАМІРАЎ...“
ЯНКА КУПАЛА.

Аўтар сцэнарыя — Г. Колас
пры ўдзеле
Т. Процька і В. Скалабана.
Рэжысёр — Ул. Бокун.

Адбудзецца сустрэча
з творчай групай фільма.

Чакаем Вас
3 снежня
ў Доме літаратара.
Пачатак а 18-й гадзіне.

ДЛ СП Беларусі.

На дзве асобы

Запрашэнне на прагляд дакументальнага фільма
«Ніколі я не паміраў» (суаўтар сцэнарыя — В.У. Скалабан).
1992 г. БДАМЛМ.




Вокладка гістарычнай драмы. 2006 г.



Сцэнарый тэлеперадачы з серыі
«Тэлебачэнне — школе».
Аўтар — В.У. Скалабан. 1990 г. НАРБ.




На прэзентацыі даведніка ў Нацыяльным архіве Рэспублікі Беларусь. 2007 г. БДАМЛМ.

**Трэба было бачыць радасць, з якой Віталь Уладзіміравіч браў у рукі гэты том... І ў гэтай радасці ён, Архівіст і Гісторык з вялікай літары, увесь — шчыры руплівец, клапатлівец на ніве ўзнаўлення і сцвярджэння гістарычнай памяці...**

А. Карлюкевіч




На прэзентацыі кнігі «Время и бремя архивов и времен» В.У. Скалабана і Л.І. Урублеўскай. 2006 г. БДАМЛМ.



У Ляхавіцкай сярэдняй школе № 2 на мерапрыемстве да 100-годдзя бацькі. 2009 г. НАРБ.



На выставе да 60-годдзя Дня Перамогі ў Маскве. 2005 г. НАРБ.



Кіназдымальная група фільма «Панцеляймон Панамарэнка». Злева направа, першы рад: пісьменнік і гісторык Л.У. Маракоў, В.У. Скалабан, кінарэжысёр А.І. Алай, другі рад: дырэктар фільма Т. Афанасьева, дырэктар НАРБ В.Д. Селяменеў. 2008 г. НАРБ.



Дырэктар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва» А.М. Карлюкевіч узнагароджвае В.У. Скалабана Ганаровай граматай у сувязі з 60-годдзем і «за плённую працу ў развіцці беларускай літаратуры і мастацтва». 2007 г. БДАМЛМ.



У Расійскай нацыянальнай бібліятэцы. 2011 г. НАРБ.

2000-я гг. НАРБ.



**Архівіст, даследчык, літаратар і проста апантаны Беларуссю чалавек... Для яго гісторыя была не столькі таямніцай, скольki крыніцай адказаў на пытанні: як жыць цяпер, якіх памылак нельга зрабіць... Нават у маленькім на першы погляд не важным дакуменце ён умеў убачыць сенсацыйныя адкрыцці...**

Чалавек-архіў // Звязда. 2011. 23 жніўня

**Его чувство юмора, доброжелательность и прощальное “Бывайце здаровенькі!” не изгладятся из памяти...**

Л. Рублевская




Памятнае мерапрыемства, прысвечанае 75-годдзю
В.У. Скалабана. 5 жніўня 2022 г.



З 2022 г. у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь штогод праходзяць Скалабанаўскія чытанні. Яны сталі пляцоўкай для сустрэч навукоўцаў, краязнаўцаў, тых, хто асабіста ведаў Віталя Уладзіміравіча, і тых, хто працягвае яго навуковыя традыцыі.




I Скалабанаўскія чытанні.
17 лістапада 2022 г.





**Ён пакінуў пра сябе памяць як пра светлага,
спрыяльнага, усмешлівага чалавека
і цвёрда перакананага ў сваёй ісціне
гісторыка і архівіста...**

Г.В. Запартыка